УДК 902/904

# ЗАСЯЛЕННЕ БЕРАГОЎ ВОЗЕРА ГАРАДЗІШЧАНСКАЕ (ПІНСКІ РАЁН) У ПОЗНЕЛЕДАВІКОВЫ ПЕРЫЯД (14-11 ТЫС. КАЛ. ГАДОЎ)

**А.Д. Гаршкоў**
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,
ales.harshkou.arch@gmai.com

**Анатацыя.** Дадзены артыкул прысвечаны праблеме засялення берагоў возера Гарадзішчанскае (Пінскі раён, Брэсцкая вобласць) у познеледавіковы перыяд. На падставе археалагічных матэрыялаў было высветлена, што вакол вадаёма ў розныя перыяды сяліліся носьбіты броме-лінгбі і свідэрскай папуляцый.

**Ключавыя словы:** познеледавіковы час, папуляцыя, археалогія, броме-лінгбі, свідэрская культура

**Уводзіны.** Тэрыторыя Беларусі, хутчэй за ўсё, упершыню цалкам была заселена ў познеледавіковы перыяд (14-11 тыс. кал. гадоў). У гэты час, на нашых абшарах фіксуецца гаспадарчая дзейнасць як мінімум пяці археалагічных папуляцый (культур): гамбургскай, броме-лінгбі, грэнскай, валкушанскай, свідэрскай. Амаль усе яны вядомы на тэрыторыі Пінскага раёна [5, с. 37]. Аднак большасць стаянак дадзеных культурных адзінак разглядаецца ў кантэксце жыццядзейнасці старажытнага чалавека ў басейнах рэк Ясельда, Прыпяць, Піна і інш.

Мы ж, гэтым артыкулам хацелі б прасачыць засяленне берагоў возера Гарадзішчанскае ў познеледавіковы перыяд праз прызму археалагічных матэрыялаў.

**Асноўная частка.** Возера Гарадзішчанскае або Палескае возера размешчана на тэрыторыі Пінскага раёна, за 12 км на паўночны ўсход ад г. Пінска. Схілы катлавіны палогія, складаюцца з пяску і апясчаненых адкладаў, пераважна разараныя ў выніку сельскагаспадарчай дзейнасці. На поўначы яно злучана з возерам Святым (Малое Гарадзішчанскае возера), на поўдні – пратокай з р. Ясельда. Памеры (максімальныя): даўжыня 1,48 км; шырыня 1,09 км; глыбіня – 8,1 м. Даўжыня берагавой лініі – 5,1 км [1, с. 282]. Па берагах возера размешчаны в. Заазер’е, п. Гарадзішча і в. Гарадзішча.

Археалагічныя даследаванні ў дадзенай мясцовасці праводзіліся Р. Гарашкевічам, У. Ф. Ісаенкай, В. Б. Пярхаўкай, В. С. Вяргей, А. В. Іовам, В. Я. Кудрашовым, А. Ф. Касюк і аўтарам дадзенага артыкула [4, с. 8-10; 2, с. 15].

Верагодна, самыя раннія на дадзены момант матэрыялы, якія зафіксаваны на берагах возера, могуць быць звязаны з носьбітамі культуры броме-лінгбі. Гэтая папуляцыя існавала на тэрыторыі Беларусі ў перыяд алерода – 13,9-12,7 тыс. кал. гадоў. Для яе характэрны чаранковыя наканечнікі, нуклеусы аднапляцовачныя і двухпляцовачныя ад пласцін і адшчэпаў, разцы рэтушныя, бакавыя, двухгранныя сярэдзінныя, канцавыя скрабкі, выкананыя на масіўных нарыхтоўках [5, с. 40-41]. Падобныя артэфакты зафіксаваныя на тэрыторыі Пінскага раёна на помніках Ботава 1; Камень 2, 4 [5, с. 102-104].

На помніку Гарадзішча 7, які размешчаны на ўсходнім беразе воз. Гарадзішчанскае, праз 100 м ад урэза вады быў знойдзены фрагмент чаранковага наканечніка стралы, выкананы на масіўнай пласціне, знятай з двухпляцовачнага монафрантальнага нуклеуса. Чаранок быў сфармаваны ў праксімальнай частцы нарыхтоўкі дарсальнай паўстромкай рэтушшу.

Падобны наканечнік таксама быў знойдзены пад час даследаванняў В. Я. Кудрашова на помніку Заазер’е 1. Дадзены артэфакт выкананы на пласціне, знятай з аднапляцовачнага нуклеуса, чаранок быў сфармаваны паўстромкай дарсальнай рэтушшу [6, с. 41, рис. 6: 5].




**Малюнак 1. – Месцаразмяшчэнне помнікаў вакол возера Гарадзішчанскае. На аснове Latlon.map**

Мажлівасць засялення берагоў возера ў перыяд алерода падцвярджаецца радыёвугляроднымі датыроўкамі арганічных адкладаў з балота Іванісаўка, якое размешчана на тэрыторыі Пінскага раёна, у 18 км на паўночны ўсход ад воз. Гарадзішчанскае. На іх паставе можна меркаваць, што ў дадзенай мясцовасці існавалі саснова-бярозавыя лясы разам з разнатраўем [3, с. 54].

Аднак гэта адзінкавыя знаходкі, якія дазваляюць нам толькі вылвігаць гіпотэзу. Палявыя даследаванні 2022 г., што праводзіліся аўтарам на помніку Гарадзішча 7, пакуль дадзенае меркаванне не падцвярджаюць. Але мы дакладна можам казаць, што ў перыяд дрыяса III (12,7-10,6 тыс. кал. гадоў) амаль усе берагі былі занятыя носьбітамі свідэрскай культуры. Для дадзенай папуляцыі характэрны чаранковыя і вербалістыя наканечнікі стрэл з плоскай рэтушшу на брушку, нуклеусы двухпляцовачныя, монафрантальныя ад пласцін, разцы двухгранныя сярэдзінныя і бакавыя, канцавыя і двайныя скрабкі. Падобныя матэрыялы зафіксаваныя на тэрыторыі Пінскага раёна на помніках Церабень; Чухава 1; Пагост-Загародскі 1, 2 і інш. [5, с. 106-107].

Што датычыцца берагоў возера Гарадзішчанскае, то матэрыялы, характэрныя для свідэрскай папуляцыі былі зафіксаваны на помніках Заазер'е 1, Гарадзішча 7. Акрамя таго, вялікая колькасць артэфактаў падобнага плану была знойдзена падчас даследаванняў гарадзішча і селішча каля в. Гарадзішча. Так, нуклеусы двухпляцовачныя монафрантальныя ад пласцін (лодкападобныя або чоўнападобныя) былі знойдзены на гарадзішчы і селішчы Гарадзішча [4, с. 150-151, с. 1-2; с. 156-157, рис. 7-8]. Скол з захлыстам, зняты з двухпляцовачнага монафрантальнага нуклеуса, зафіксаваны намі пад час даследаванняў у 2022 г. на стаянцы Гарадзішча 7. Чаранковыя і вербалістыя наканечнікі з плоскай рэтушшу прысутнічаюць у калекцыі з помнікаў гарадзішча і селішча Гарадзішча, Заазер'е 1 [4, с. 152, рис. 3; с. 158, рис. 9; 6, с. 40]. Разцы двухгранныя і канцавыя скрабкі зафіксаваны на гарадзішчы і селішчы Гарадзішча [4, с. 152, рис. 3; с. 153, рис. 4]




**Малюнак 2. – Крамянёвыя артэфакты познеледавіковага часу з даследаванняў помнікаў вакол возера Гарадзішчанскае. 1-4 – нуклеусы; 5-12 – наканечнікі і фрагменты наканечнікаў. 1 – селішча Гарадзішча; 2-3, 7-11 - гарадзішча Гарадзішча; 4, 6, 12 – Заазер'е 1; 5 – Гарадзішча 7. Малюнкі У. П. Ксяндзова – 1-3, 7-11; В. Я. Кудрашова – 4, 6, 12; А. Д. Гаршкова – 5.**

**Высновы.** На дадзены момант, мы можам меркаваць, што засяленне берагоў возера Гарадзішчанскае ў познеледавікоўе пачалося ў перыяд алероду (13,9-12,7 тыс. кал. гадоў). Падставай для дадзенай гіпотэзы з'яўляюцца знаходкі чаранковага наканечніка на помніку Заазер'е 1 і фрагмент падобнага артэфакта на стаянцы Гарадзішча 7. Аднак гэтыя матэрыялы адзінкавыя, што гаворыць аб перспектывах далейшых археалагічных даследаванняў.

Дакладна мы можам меркаваць аб засяленні возера ў перыяд існавання на тэрыторыі Беларусі свідэрскай папуляцыі (12,7-11,6 тыс. кал. гадоў). У калекцыях з помнікаў Заазер'е 1, Гарадзішча 7, а таксама сярэднявечным гарадзішчы і селішчы каля в. Гарадзішча зафіксаваны амаль усе характэрных для дадзенай культурнай адзінкі тыпы артэфактаў. Гэта, на наш пункт гледжання, гаворыць аб інтэнсіўным засяленні дадзенай тэрыторыі ў канцы познеледавіковага перыяду.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Блакітная кніга Беларусі: энцыкл. / Рэдкал.: Н. А. Дзісько, М. М. Курловіч, Я. В. Малашэвіч і інш.; Маст. В. Г. Загародні. – Мн.: БелЭн, 1994. – 415 с.

2. Гаршкоў, А. Д. Папярэднія вынікі даследаванняў каля в. Заазер'е і пас. Гарадзішча Пінскага раёна Брэсцкай вобласці / А. Д. Гаршкоў, А. Ф. Касюк // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: сборник научных статей по материалам V Международной научной конференции, Пинск, 27 ноября 2020 г. / Министерство образования Республики Беларусь [и др.]; редкол.: К.К. Шебеко [и др.]. – Пинск : ПолесГУ, 2020. – Вып. 5. – С. 13-21.

3. Зерницкая, В. П. Позднеледниковье и голоцен Беларуси: геохронология, осадконакопление, растительность и климат / В. П. Зерницкая. – Минск : Беларуская навука, 2022. – 303 с.
4. Іоў, А. В. Старажытнае паселішча на Ясельдзе / А. В. Іоў, В. С. Вяргей. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – 175 с.
5. Калечыц, А.Г. Палеалітычныя помнікі Беларусі: (культурна-храналагічная ідэнтыфікацыя крыніц) / А. Г. Калечыц, А. У. Коласаў, В.С. Абухоўкі. – Мінск: Беларус. навука, 2010. – 323 с.
6. Кудряшов, В.Е. Заозерье – памятник свидерской культуры Припятского Полесья Беларуси // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск, 1996. – № 7. – С. 35-45.